ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэннем педагагічнага савета
ад 30.08. 2016 г. , пратакол № 1
Загад ад 31.08.2016 г. № 170

**Палажэнне аб метадычным савеце**
**ўстановы адукацыі**

**I. Агульныя палажэнні**

Метадычны савет (далей савет) ствараецца з мэтай каардынацыі дзейнасці ўсіх структурных падраздзяленняў метадычнай службы ўстановы адукацыі.

Савет з'яўляецца калектыўным грамадскім органам, аб'ядноўвае на дабравольнай аснове супрацоўнікаў установы адукацыі.

Савет з'яўляецца кансультатыўным органам па пытаннях арганізацыі метадычнай работы ва ўстанове адукацыі.

Метадычны савет у сваёй дзейнасці выконвае закон «Аб правах дзіцяці», кіруецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, нарматыўнымі дакументамі органаў упраўлення адукацыі ўсіх узроўняў па пытаннях адукацыйнай, метадычнай, вопытна-эксперыментальнай і праектна-даследчай дзейнасці, а таксама статутам і лакальнымі прававымі актамі ўстановы адукацыі.

**II. Мэты і задачы метадычнага савета**

Метадычны савет ствараецца для рашэння наступных мэтаў і задач, ускладзеных на ўстанову адукацыі:

- каардынацыя дзейнасці метадычных фарміраванняў і іншых структурных падраздзяленняў метадычнай службы ўстановы адукацыі, накіраванай на рашэнне метадычнага аб'яднання выхаваўчага працэсу;
- распрацоўка і забеспячэнне рэалізацыі асноўных напрамкаў МР;
- забеспячэнне метадычнага суправаджэння вучэбных праграм, распрацоўка вучэбных, навукова-метадычных і дыдактычных матэрыялаў;
- арганізацыя вопытна-пошукавай, інавацыйнай і праектна-даследчыцкай дзейнасці ва ўстанове адукацыі, накіраванай на засваенне новых педагагічных тэхналогій, распрацоўку аўтарскіх праграм, апрабацыю вучэбна-метадычных комплексаў і г.д.
- арганізацыя кансультавання супрацоўнікаў установы адукацыі па праблемах удасканалення прафесійнага майстэрства, методыкі правядзення разнастайных відаў заняткаў і іх вучэбна-метадычнага, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння;
- распрацоўка мерапрыемстваў па фарміраванню, абагульненню і распаўсюджанню ППВ педагогаў установы адукацыі;
- удзел у атэстацыі педагогаў установы адукацыі;

- правядзенне эксперыментальнай работы па пошуку і апрабацыі новых форм і метадаў навучання;
- забеспячэнне прафесійнага станаўлення маладых педагогаў;
- арганізацыя ўзаемадзеяння з іншымі ўстановамі адукацыі, навукова-даследчыцкімі ўстановамі з мэтай абмена вопытам і перадавымі тэхналогіямі ў вобласці адукацыі;
- укараненне ў адукацыйны працэс сучасных вучэбна-метадычных і дыдактычных матэрыялаў і праграмнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм навучання, сістэм інфармацыйнага забеспячэння заняткаў, інфармацыйна-бібліятэчных сістэм. Распрацоўка праграмнага забеспячэння для правядзення вучэбных заняткаў і ўкараненне іх у адукацыйны працэс

**ІІІ. Асноўныя напрамкі дзейнасці метадычнага савета:**

- аналіз вынікаў адукацыйнай дзейнасці па вучэбных прадметах;
- удзел у распрацоўцы варыятыўнай часткі вучэбных планаў, унясенне змен у патрабаванні да мінімальнага аб'ёму і зместу вучэбных праграм;
- разгляд і ацэнка інтэгрыраваных вучэбных праграм па вывучаемых прадметах і ўзгадненне іх з праграмамі сумежных дысцыплін для больш поўнага забеспячэння засваення вучнямі патрабаванняў дзяржаўных адукацыйных стандартаў;
- абмеркаванне рукапісаў вучэбна-метадычных дапаможнікаў і дыдактычных матэрыялаў па прадметах;
- падрыхтоўка і абмеркаванне дакладаў па пытаннях развіцця сучаснай псіхолага-педагагічнай навукі, методыкі выкладання вучэбных прадметаў, павышэння кваліфікацыі, развіцця майстэрства і творчасці настаўнікаў і др.
- абмеркаванне каляндарна-тэматычных планаў;
- абмеркаванне методыкі правядзення асобных відаў вучэбных заняткаў і зместу дыдактычных матэрыялаў да іх;
- разгляд пытанняў арганізацыі, кіраўніцтва і кантролю даследчай работы вучняў;
- арганізацыя і правядзенне педагагічных эксперыментаў па пошуку і ўкараненню сучасных адукацыйных і новых інфармацыйных тэхналогій навучання;
- арганізацыя ўзаемнага наведвання заняткаў як унутры метадычнага фарміравання, так і паміж настаўнікамі розных метадычных структур з мэтай абмену вопытам і ўдасканалення методыкі выкладання вучэбных прадметаў;
- правядзенне сумесных пасяджэнняў з роднаснымі і ўзаемазабяспечваючымі метадычнымі фарміраваннямі з мэтай абмену вопытам работы;
- вывучэнне вопыту работы роднасных метадычных структур устаноў адукацыі і абмен вопытам работы;
- арганізацыя стажыроўкі, настаўніцтва;

- распрацоўка палажэнняў аб правядзенні конкурсаў, алімпіяд, спаборніцтваў па вучэбных прадметах;
- абмеркаванне і дапрацоўка (па меры неабходнасці) лакальных нарматыўных дакументаў адукацыйнай вобласці.

**IV. Арганізацыя работы метадычнага савета**

У склад савета ўваходзяць кіраўнікі структурных падраздзяленняў метадычнай службы (МА), вопытныя настаўнікі, дырэктар (або) намеснік дырэктара ўстановы адукацыі. Склад савета зацвярджаецца загадам дырэктара.

У складзе савета могуць фарміравацца секцыі па розных напрамках дзейнасці (праектна-даследчая, інавацыйная, дыягнастычная, абнаўленне зместу адукацыі і т.п.).

Кіруе саветам, як правіла, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце.

Работа савета ажыццяўляецца на аснове плана на цякучы год. План складаецца членамі метадычнага савета на чале з кіраўніком, на аснове перспектыўнай праграмы ўстановы адукацыі, плана ўстановы адукацыі, разглядаецца на пасяджэнні, зацвярджаецца дырэктарам .

Перыядычнасць пасяджэнняў савета – не радзей аднаго раза ў чвэрць. Пры разглядзе пытанняў, якія закранаюць другія напрамкі адукацыйнай дзейнасці , на пасяджэнні запрашаюцца адпаведныя пасадзе асобы. Па кожнаму з абмяркоўваемых на пасяджэнні пытанняў прымаюцца рашэнні, якія носяць рэкамендацельны характар і фіксуюцца ў пратаколе. Пратакол вядзецца ў скарочанай форме, падпісваецца намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце і сакратаром МС.

**V. Правы і абавязкі метадычнага савета**

Метадычны савет мае наступныя правы:

- рыхтаваць прапановы і рэкамендаваць настаўнікаў для павышэння кваліфікацыйнай катэгорыі;
- выказваць прапановы аб удасканаленні адукацыйнага працэсу;
- ставіць пытанні аб публікацыі матэрыялаў з вопыту работы педагогаў установы адукацыі;
- ставіць пытанне перад адміністрацыяй аб заахвочванні супрацоўнікаў за актыўны ўдзел у даследча-эксперыментальнай, навукова-метадычнай і праектна-даследчай дзейнасці;
- рэкамендаваць павышэнне кваліфікацыі;
- прапаноўваць настаўнікаў для ўдзелу ў конкурсах “Настаўнік года” і “Класны кіраўнік года”;
- выконваць экспертныя і кансалтынгавыя функцыі;

Метадычны савет абавязаны:

- ведаць заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь і нарматыўныя прававыя дакументы па пытаннях адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, метадычнай работы; асновы працоўнага заканадаўства;

- у сваёй рабоце кіравацца дадзеным палажэннем;
- ажыццяўляць работу ў адпаведнасці з зацверджаным планам;
- выказваць прапановы па ўдасканаленню дзейнасці агульнашкольнай метадычнай службы;
- несці адказнасць за стан (узровень) работы метадычных фарміраванняў установы адукацыі і інш.